● Энтузіясты

# БІБЛІЯТЭЦЫ—40 ГОД

У 1991 годзе Баханоўскай сельскай бібліятэцы спаўняецца 40 год. 10 мая 1951 года рашэннем выканаўчага камітэта Хоцімскага раённага Савета дэпутатаў працоўных з 1 чэрвеня 1951 года ў Баханоўскім сельскім Савеце створана сельская бібліятэка.

Першым бібліятэкарам у вёсцы Баханы была Радзькова Вольга Дзянісаўна. Вось што яна ўспамінае аб гэтым.

Стварэнне Баханоўскай сельскай бібліятэкі супадае са знамянальнай падзеяй у маім жыцці. Як раз у 1951 годзе я скончыла Магілёўскае культасветвучылішча і была накіравана на работу ў Хоцімскі раён. Раённы аддзел культуры накіраваў мяне загадчыцай толькі што створанай сельскай бібліятэкі. Да гэтага жыхары вёскі абслугоўваліся кнігай праз хату-чытальню, якой загадваў Касцюшкін Адам Васільевіч.

З кніжнага фонда хаты-чытальні для стварэння фонда бібліятэкі было адабрана 90 экземпляраў кніг.

Матэрыяльная база бібліятэкі ў той час была вельмі беднай. Папаўненне кніжнага фонда вялося дрэнна, так як адпускаемыя сродкі не заўсёды скарыстоўваліся па прызначэнню. Уся маёмасць бібліятэкі размяшчалася ў дзвюх шафах, быў адзін стол, крэсла, зробленыя рукамі аднавяскоўцаў-умельцаў.

Прапаганда кнігі праводзілася ў асноўным праз рэкамендацыйныя спісы, гутаркі, бібліяграфічныя агляды. Нягледзячы на невялікі кніжны фонд чытачы ішлі ў бібліятэку.

Да 1957 года кніжны фонд папоўніўся прыкладна да 3-х тысяч кніг, чытачоў 396 чалавек. У лютым 1957 года бібліятэка была пераведзена ў вёску Юзяфоўка, якая ў той час уваходзіла ў склад Баханоўскага сельскага Савета. Загадчыцай бібліятэкі стала Марыя Хадарэнка.

У 1959 годзе бібліятэка зноў пераводзіцца ў вёску Баханы і я ўзначальваю яе. У памяшканні сельскага Савета бібліятэка знаходзілася да 1965 года. У 1965 годзе праўленне калгаса «Чырвоны маяк» выдзяляе памяшканне і бібліятэка пераводзіцца ў клуб, былое памяшканне канторы калгаса.

Дзякуючы добрай дапамозе з боку актыву і савета бібліятэкі ў 1968 годзе бібліятэцы прысвойваецца званне «Бібліятэка выдатнай работы».

**У. РАБЦАЎ,**
**бібліятэкар сельскай бібліятэкі.**

**Рабцаў, У.** Бібліятэцы – 40 год / У. Рабцаў // Шлях Кастрычніка. — 1990. — 12 чэрвеня. — С. 2.

*10 мая 1951 года рашэннем выканаўчага камітэта Хоцімскага раённага Савета дэпутатаў працоўных з 1 чэрвеня 1951 года ў Баханоўскім сельскім Савеце створана сельская бібліятэка.*